ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратаколам
Савета аддзела культуры
Пінскага райвыканкама
ад 27.10 2022 № 10
г. Пінск

Аб вyніках раённага агляду-конкурсу на лепшую тэатралізацыю твораў Я.Коласа «Якуба слова - дзіўны дар»

З мэтай азнаменавання 140-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, папулярызацыі творчай спадчыны пісьменніка, прывіцця любові да роднай мовы, павышэння цікавасці да чытання, выхавання патрыятычнага пачуцця гонару і любові да роднага краю, развіцця творчай актыўнасці чытачоў бібліятэк у дзяржаўнай установе культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» адбыўся раённы агляд-конкурс на лепшую тэатралізацыю твораў Я.Коласа «Якуба слова - дзіўны дар».

У аглядзе-конкурсе прымалі ўдзел 27 бібліятэкі.

Разглядзеўшы конкурсныя матэрыялы, Савет аддзела культуры Пінскага райвыканкама ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Прызнаць пераможцамі раённага агляду-конкурсу на лепшую тэатралізацыю твораў Я.Коласа «Якуба слова - дзіўны дар» з уручэннем Дыпломаў аддзела культуры Пінскага райвыканкама і падарункаў:

1. Пінкавіцкую сельскую бібліятэку (загадчык Палюховіч Ірына Анатольеўна) – 1 месца за тэатралізацыю вершаванага апавядання Якуба Коласа «Зяць»;
2. Малоткавіцкую сельскую бібліятэку (загадчык Бойка Наталія Емельянаўна) – 2 месца за тэатралізацыю трылогіі Якуба Коласа «На ростанях»;
3. Стытычаўскую сельскую бібліятэку (бібліятэкар 2 катэгорыі Літвінчук Марына Фёдараўна) – 3 месца за тэатралізацыю аповесці Якуба Коласа «На прасторах жыцця».

Кантроль за выкананнем Пастановы ўскласці на дырэктара ДзУК Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Антанчук В.М.